ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 26 (626) | Субота, 11 кастрычніка 1986 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## НЕАДКЛАДНЫЯ ЗАДАЧЫ ГРАМАДАЗНАЎЦАЎ

### ЯНЫ ВЫЗНАЧАНЫ НА ЎСЕСАЮЗНАЙ НАРАДЗЕ

Важнай падзеяй у жыцці краіны стала правядзенне 1—3 кастрычніка ў Маскве Усесаюзнай нарады загадчыкаў кафедр грамадскіх навук.

Нараду адкрыў Генеральны сакратар ЦК КПСС М. С. Гарбачоў. З вялікай увагай слухалі ўдзельнікі нарады — грамадазнаўцы, рэктары ВНУ, партыйныя работнікі, якія сабраліся ў Вялікім Крамлёўскім палацы, яркую, змястоўную прамову М. С. Гарбачова. У ёй гаварылася аб узрослым значэнні ідэйна-выхаваўчай работы, глыбокага вывучэння марксісцка-ленінскай тэорыі, раскрыты шляхі далейшага развіцця грамадскіх навук. У дакладзе члена Палітбюро ЦК КПСС, сакратара ЦК КПСС Я. К. Лігачова быў дадзен усебаковы аналіз выкладання грамадскіх навук у вышэйшай школе і нашага грамадазнаўства ў цэлым, вызначаны задачы іх далейшага ўдасканалення. У дакладзе міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР Г. А. Ягадзіна былі раскрыты шляхі перабудовы вышэйшай школы і выкладання грамадскіх навук.

Як падкрэсліў у сваёй прамове М. С. Гарбачоў, рэалізацыя курса на паскарэнне, на перабудову, на дасягненне якасна новага стану савецкага грамадства немагчыма без актывізацыі ідэйна-тэарэтычнай дзейнасці. Перабудова, якая шырока разгортваецца ў краіне, дае вельмі адказны сацыяльны заказ усёй сістэме грамадскіх навук. Патрэбны глыбокія навуковыя даследаванні на матэрыяле сучаснага жыцця дыялектыкі прадукцыйных сіл і вытворчых адносін, сацыялістычнай уласнасці, кааперацыі, народнага самакіравання і дэмакратыі, развіцця грамадскай свядомасці, прычын і шляхоў пераадолення негатыўных з'яў і многіх іншых праблем. «Сёння перад грамадствам, — сказаў М. С. Гарбачоў,— стаіць задача пераадолець утварыўшуюся аддаленасць ад патрэб жыцця. Нам надзённа неабходны рашучы паварот усяго фронту грамадазнаўства тварам да практыкі... Умацаванне сувязі тэорыі з практыкай — не проста агульны заклік. Гэта — ключ да перабудовы грамадазнаўства, прынцып работы вучоных, выкладчыкаў».

На нарадзе адзначалася, што перабудова вышэйшай школы самым непасрэдным чынам закранае кафедры грамадскіх навук. У сваім дакладзе Я. К. Лігачоў падкрэсліў, што ў прымяненні да грамадскіх навук «перабудова азначае перш за ўсё карэннае павышэнне якасці выкладання, яго эфектыўнасці». Для таго, каб дабіцца гэтага, неабходна, папершае, рашуча наблізіць выкладанне да практыкі, пазбавіць лекцыі і семінары ад спрошчаных уяўленняў аб сацыялізме... У выкладанні грамадскіх навук пакуль не хапае ленінскай праўды... Па-другое, вузлавы момант перабудовы — гэта павышэнне ідэйна-тэарэтычнага, вучэбна-метадычнага ўзроўню выкладання. Крайне важна ў працэсе перабудовы ўхіліць далёка зайшоўшую дыферэнцыяцыю ў выкладанні грамадскіх навук, міждысцыплінарныя бар'еры. Неабходна пераадольваць фармальныя адносіны да арганізацыі вучэбнага працэсу, поўнасцю адмовіцца ад «пытальніцка-адказнага метаду». Па-трэцяе, перабудова азначае ўсямерную актывізацыю навукова-даследчай работы кафедр. Навуковая работа выкладчыка — залог яго прафесіянальнага росту, умова высокай якасці педагагічнага працэсу.

Поспех справы перабудовы вышэйшай школы, работы кафедр грамадскіх навук, адзначыў Я. К. Лігачоў, у значнай ступені залежыць ад якасці партыйнага кіраўніцтва гэтым працэсам. Ключавое звяно партыйнага кіраўніцтва — гэта падбор, расстаноўка і выхаванне прафесарска-выкладчыцкіх кадраў. Партыйным арганізацыям неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на развіццё ў ВНУ, у выкладчыцкім асяроддзі крытыкі і самакрытыкі, галоснасці.

На нарадзе падкрэслівалася, што для фарміравання ў будучых спецыялістаў навуковага светапогляду, выхавання ідэйнай перакананасці неабходны не толькі ўдасканальванне выкладання грамадскіх навук, але і перабудова работы студэнцкай моладзі, паляпшэнне адносін студэнтаў да вучобы, да вывучэння марксісцка-ленінскай тэорыі. У сваім дакладзе Я. К. Лігачоў адзначыў, што крайне важна ствараць абстаноўку найбольшага спрыяння для студэнтаў, якія добра вучацца. Ва універсітэтах, інстытутах павінен панаваць культ вучобы, культ сур'ёзнай самаадданай работы над разуменнем ісціны, над набыццём новых ведаў. Гэта — найпершы і самы галоўны абавязак студэнта.

Важнейшая задача грамадазнаўцаў — паляпшэнне выхавання студэнтаў. Вышэйшая школа заклікана выхоўваць будучых спецыялістаў у духу калектывізму, таварыскасці, рашуча выкараняць любыя праяўленні ў студэнцкім асяроддзі індывідуалізму, кар'ерызму, раўнадушша. Трэба актыўна процістаяць пранікненню ў студэнцкія калектывы халтуры, шэрасці і пошласці. Неабходна больш настойліва і эфектыўна фарміраваць здаровыя эстэтычныя густы савецкай моладзі, палепшыць атэістычнае выхаванне.

Прамова М. С. Гарбачова, даклады Я. К. Лігачова і Г. А. Ягадзіна былі выслуханы ўдзельнікамі нарады з вялікай увагай і атрымалі іх гарачае адабрэнне. У спрэчках на пленарных пасяджэннях выступілі 20 чалавек, а на секцыйных — 110 удзельнікаў нарады. Усе выступіўшыя высока ацанілі ўвагу і клопаты партыі аб развіцці грамадскіх навук і называлі канкрэтныя шляхі і меры па іх удасканальванню.

На нарадзе чотка вызначаны задачы і шляхі далейшага ўдасканальвання выкладання грамадскіх навук. Цяпер прадстаіць хутчэй перабудоўваць работу кафедр грамадскіх навук і эфектыўней рэалізоўваць рэкамендацыі Усесаюзнай нарады.

Калектывам кафедр грамадскіх навук нашага універсітэта неабходна істотна палепшыць сваю дзейнасць, падняць на больш высокі якасны ўзровень ўсю вучэбную, вучэбна-метадычную, навукова-даследчую і палітыка-выхаваўчую работу. У святле патрабаванняў нарады ўсім грамадазнаўцам трэба цясней увязваць выкладанне з жыццём, з задачамі ўдасканальвання сацыялізму, паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Нам неабходна хутчэй і поўнасцю выкараніць элементы схаластыкі, дагматызму, начотніцтва ў выкладанні. Трэба больш актыўна прымяняць праблемны метад, тэхнічныя сродкі навучання, дзелавыя гульні і іншыя метады пазнавальнай дзейнасці студэнтаў. Асаблівую ўвагу варта звярнуць на глыбокае вывучэнне матэрыялаў XXVII з'езда КПСС, чэрвеньскага (1986 г.) Пленума ЦК КПСС і іншых дакументаў партыі і савецкага ўрада, прамоў і выступленняў Генеральнага сакратара ЦК КПСС М. С. Гарбачова.

У галіне навуковых даследаванняў кафедры грамадскіх навук ГДУ памножаць свае намаганні па павышэнню якасці праводзімых навукова-даследчых работ, па ўмацаванню сувязі кафедр з вытворчасцю. Кафедра палітэканоміі, у прыватнасці, асаблівую ўвагу будзе ўдзяляць паспяховай рэалізацыі доўгатэрміновага дагавору аб сацыялістычным супрацоўніцтве з вытворчым аб'яднаннем «Гомсельмаш». Патрабуе ўзмацнення практычная накіраванасць і індывідуальных навуковых даследаванняў многіх грамадазнаўцаў нашага універсітэта.

У святле патрабаванняў Усесаюзнай нарады неабходна і актывізацыя праводзімай грамадазнаўцамі палітыка-выхаваўчай работы. Трэба ўзмацніць прапаганду рашэнняў XXVII з'езда партыі, чэрвеньскага (1986 г.) Пленума ЦК КПСС, іншых дакументаў партыі і ўрада сярод працоўных і студэнтаў. Усе выкладчыкі кафедр грамадскіх навук павінны больш актыўна і плённа ўдзельнічаць у палітыка-выхаваўчай рабоце са студэнтамі, якая вядзецца на факультэтах, шукаць і выкарыстоўваць новыя формы гэтай работы, узмацняць індывідуальны падыход да моладзі.

Відавочна, што рашэнні нарады датычаць не толькі выкладчыкаў кафедр грамадскіх навук, але ўсіх выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў ВНУ. Ажыццяўленне гэтых рашэнняў магчыма толькі агульнымі намаганнямі.

**У. БОНДАРАЎ,**
**дацэнт, загадчык кафедры палітэканоміі, удзельнік Усесаюзнай нарады загадчыкаў кафедр грамадскіх навук.**

## УДАСТОЕНЫ МЕДАЛЯ ВДНГ

**У павільёне «Будаўніцтва» ВДНГ СССР экспанаваўся турнікет «Будаўніцтва ў складаных горна- і інжынерна-геалагічных умовах». Ён адлюстроўвае распрацоўку калектываў навукова-даследчага інстытута фундаментаў і падземных збудаванняў і Дзяржынскай карставай лабараторыі вытворчага НДІ інжынерных пошукаў у будаўніцтве Дзяржбуда СССР новай методыкі вызначэння разліковага размеру карставага правалу пры праектаванні супрацькарставых фундаментаў. Матэматычнае забеспячэнне на ЭВМ для гэтай методыкі распрацавана дацэнтам кафедры вылічальнай матэматыкі і праграміравання ГДУ П. Д. Грыгаруком.**

**Рэкамендацыі вучоных прыносяць значны эканамічны эфект. Іх укараненне толькі ў сістэме Кіеўскага дзяржаўнага інстытута праектавання горадабудаўніцтва з'эканоміць 81 тысячу рублёў..**

**Калектыў аўтараў новай методыкі заахвочан Галоўным камітэтам ВДНГ СССР. Бронзавага медаля ўдастоены і дацэнт П. Д. Грыгарук.**

●

## АЎТАРУ — ДЫПЛОМ ГОНАРУ

**У 1984 годзе ў беларускім выдавецтве «Вышэйшая школа» быў выдадзены вучэбны дапаможнік «Гісторыя эканамічных вучэнняў». Яго аўтар — прарэктар нашага універсітэта па навуковай рабоце прафесар М. В. Навучыцель. Гэта кніга была сустрэта з прыхільнасцю як студэнтамі, так і выкладчыкамі, атрымала станоўчую рэцэнзію, змешчаную ў часопісе «Экономические науки» (№ 8, 1986 г.).**

**Названы вучэбны дапаможнік дэманстраваўся ў павільёне «Народная адукацыя» ВДНГ СССР і атрымаў высокую ацэнку. Яго аўтар прафесар М. В. Навучыцель узнагароджаны Дыпломам гонару.**

## У ЛІКУ ПЕРАМОЖЦАЎ

Ва Усесаюзным аглядзе работы народных універсітэтаў культуры, які праходзіў сёлета ў краіне, прымаў удзел народны універсітэт маральна-эстэтычнага выхавання ГДУ. За дасягнутыя поспехі ў маральным выхаванні студэнцкай моладзі ён названы ў ліку пераможцаў усесаюзнага агляду.

У лютым 1987 года на ВДНГ СССР адбудзецца злёт народных універсітэтаў-пераможцаў. Рыхтуе матэрыялы для экспанавання на галоўнай выстаўцы краіны і народны універсітэт маральна-эстэтычнага выхавання нашага універсітэта.

(Наш кар.).

## ЗА СТАРАННАСЦЬ У ПРАЦЫ

Сем студэнтаў нашага універсітэта адправіліся ў цікавае падарожжа па гарадах ЧССР і Сацыялістычнай Федэратыўнай Рэспублікі Югаславіі. Ганаровае права атрымаць ільготныя пуцёўкі для паездкі ў братнія сацыялістычныя краіны, пазнаёміцца з іх славутасцямі яны заваявалі сваёй самаадданай, ударнай працай у час трэцяга працоўнага семестра-86.

Мінулае лета рабяты правялі ў Хойніцкім раёне, які пацярпеў ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. У гарачы і напружаны час там вельмі спатрэбіліся студэнцкія рукі — на ўзвядзенні жылля для эвакуіраваных з зоны Чарнобыльскай АЭС, для работы на канвеерах Хойніцкага кансервавага завода. У саставе атрада «Эканаміст», які будаваў жылыя дамы ў саўгасе «Вялікаборскі», працавалі будучыя эканамісты Яўген Белаш, Сяргей Пінчук, Георгій Лапінскі, Юрый Бандарэнка. Значную дапамогу аказалі рабочым кансервавага завода ў перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі студэнткі гісторыка-філалагічнага факультэта Іна Барысава, Таццяна Кошалева, Валянціна Седарэнка.

І вось цяпер ва ўсіх іх — цікавыя і захапляючыя дні знаёмства з Чэхаславакіяй і Югаславіяй, аб якіх яны, байцы працоўнага лета-86, будуць доўга памятаць, дзяліцца сваімі ўражаннямі з таварышамі па вучобе, сябрамі.

(Наш кар.).

# КОНКУРСНЫМ РАБОТАМ—ЯКАСЦЬ

Падведзены вынікі рэспубліканскага конкурсу 1985—86 навучальнага года на лепшую навуковую работу студэнтаў па прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках. Пры ацэнцы студэнцкіх навуковых работ конкурсныя камісіі кіраваліся класіфікацыяй:

— актуальнасць тэмы — ад 2 да 5 балаў;
— арыгінальнасць матэрыялу — ад 5 да 10 балаў;
— самастойнасць работы — плюс або мінус 2 балы;
— вынікі даследавання — ад 5 да 10 балаў;
— якасць афармлення — ад 2 да 5 балаў.

За работы, выкананыя на ўзроўні вынаходніцтваў, або ўкаранёныя ў народную гаспадарку (вучэбны працэс), апублікаваныя ў друку, налічваецца дадаткова 5 балаў.

Работы, якія набралі ад 30 балаў і вышэй, прадстаўляліся конкурснымі камісіямі да ўзнагароджання Дыпломам Мінвуза БССР (з прэміяй і без прэмій), Дыпломам БРС НТТ або рэспубліканскага прэзідыума навукова-тэхнічнага таварыства з прэміямі.

Аўтары работ, набраўшыя ад 27 да 29 балаў, прадстаўляліся да ўзнагароджвання Дыпломамі БРС НДРС, ад 20 да 27 балаў — заахвочваюцца ў ВНУ. Не рэкамендуюцца да заахвочвання работы, атрымаўшыя менш 20 балаў.

Па выніках конкурсу дзве навуковыя работы ўзнагароджаны Дыпломамі Мінвуза БССР і ЦК ЛКСМБ, 5 работ — Дыпломамі Мінвуза БССР і ЦК ЛКСМБ з прэміямі, дзве — Дыпломамі навуковых таварыстваў, 27 — Дыпломамі БРС НДРС, унутры ВНУ рэкамендавана заахвоціць 25 работ. Толькі адна конкурсная работа не заахвочана.

Сярод універсітэтаў рэспублікі колькасць узнагароджаных конкурсных работ у працэнтных адносінах ад агульнай колькасці склала: ГДУ — 58,1%, БДУ імя У. І. Леніна — 57,3%, Гродзенскі дзяржуніверсітэт — 50%.

Дыпломамі Мінвуза БССР і ЦК ЛКСМБ узнагароджаны навуковыя работы студэнтаў: М. Нікіценкі (фізічны факультэт, навуковы кіраўнік кандыдат тэхнічных навук дацэнт В. А. Яцкевіч), студэнтаў геалагічнага факультэта В. Дашкевіча, Г. Осіпава, А. Соіча (навуковыя кіраўнікі кандыдаты геолага-мінералагічных навук дацэнты У. П. Карташоў і А. А. Недавізін).

Дыпломамі Мінвуза БССР і ЦК ЛКСМБ з прэміяй узнагароджаны работы С. Новікава (навуковы кіраўнік к. ф.-м. н. дацэнт В. С. Манахаў), Г. Ганзар (навуковы кіраўнік асістэнт А. Ф. Рогалеў), Л. Патапенка (навуковы кіраўнік к. філ. н. дацэнт В. А. Гуліцкая), Г. Семчанка (навуковы кіраўнік к. філ. н. дацэнт У. В. Казлоў), А. Быкава (навуковы кіраўнік к. т. н. дацэнт М. І. Ягоранкаў).

Дыплома рэспубліканскага навуковага эканамічнага таварыства (НЭТ) і прэміі ўдастоена работа студэнткі эканамічнага факультэта Л. Хаменка (навуковы кіраўнік к. э. н. дацэнт Г. К. Балтрушэвіч).

Дыпломам рэспубліканскага навукова-тэхнічнага таварыства «Горнае» і прэміяй узнагароджана студэнтка геафака А. Кацуба (навуковы кіраўнік к. г.-м. н. дацэнт В. П. Жогла).

За забеспячэнне якаснага кіраўніцтва студэнцкімі навуковымі работамі Дыплома Мінвуза БССР удастоены дацэнты В. А. Яцкевіч, У. П. Карташоў, А. А. Недавізін.

Вынікі рэспубліканскага конкурсу паказалі, што разам з дасягнутымі поспехамі ў падрыхтоўцы і правядзенні конкурсу мелі месца і недахопы: не ўсе факультэты прадставілі на конкурс належную колькасць работ, здараліся выпадкі неахайнага іх афармлення, у некаторых сустракаліся арфаграфічныя памылкі.

**А. ГАЕЎ,**
**загадчык СКБ.**

*Археалагічныя раскопкі*

# ДОТЫК ДА ГІСТОРЫІ

Нам, групе абітурыентаў, якія паспяхова здалі ўступныя экзамены, яшчэ ў жніўні прапанавалі ўдзельнічаць у археалагічных раскопках у цудоўным кутку нашага горада — у парку культуры і адпачынку імя Луначарскага. Такую прапанову мы прынялі з задавальненнем: нас прыцягвала магчымасць дакрануцца да невядомых старонак гісторыі Гомеля, першымі, калі пашанцуе, патрымаць у руках рэчы, якімі карысталіся нашы продкі—радзімічы. Пазней увачавідкі пераканаліся, што цікавасць да мінуўшчыны жыве не толькі ў нас, будучых гісторыкаў і філолагаў, але, бадай, у кожнага жыхара горада. На месцы раскопак пабывала мноства людзей. Усіх хвалявала пытанне: што там, пад напластаваннямі зямлі?

Сёння, калі ў асноўным мы выканалі сваё заданне, хочацца сказаць: работа наша не была марнай. Нам пашанцавала ўзняць цікавыя археалагічныя знаходкі, якія паслужаць падмацаваннем меркаванняў, што звязаны з вывучэннем гістарычных і лінгвістычных крыніц. Адначасова экспазіцыі абласнога краязнаўчага музея, які, дарэчы, размешчаны побач з раскопкамі, папоўняцца бранзалетамі, бусамі, спражкамі, шматлікімі прадметамі гаспадарчага ўжытку, якімі карысталіся першапасяленцы па-над Сожам.

Ужо цяпер несумненна, што горад значна старэйшы, чым сведчаць пісьмовыя крыніцы. Як вядома, Гомій упершыню ўпамінаецца ў Іпацьеўскім летапісу пад 1142 годам у сувязі з барацьбой чарнігаўскіх і смаленскіх князёў. А вось гістарычны культурны слой, які адклаўся на месцы сённяшніх раскопак, а таксама на вуліцах Камісарава, Гагарына, Пралетарскай, плошчы імя Леніна, захоўвае рэшткі матэрыяльнай культуры X стагоддзя. Значыць, шлях «на радимиче» быў вядомы раней агульнапрынятага і, магчыма, пасля дакладнага вывучэння давядзецца мяняць абвестку пры ўездзе ў Гомель з боку Касцюкоўкі. Пакуль ёсць ускосны доказ: у дагаворы кіеўскага князя Ігара з грэкамі ад 945 года ўпамінаецца імя невядомага Гамолы. Вось дзе могуць утрымлівацца нашы меркаванні аб часе засялення і паходжанні назвы горада. Але што было першым: тапанім ці ўласнае імя? Відаць, хутчэй за ўсё назва мясцовасці, пасялення. На карысць гэтага сведчаць шматлікія лінгвістычныя доказы.

З цягам часу многае будзе разгадана. Нам жа, цяпер ужо студэнтам, вельмі прыемна, што мы ўдзельнічалі ў разгадках таямніц далёкай мінуўшчыны — гістарычных і філалагічных. Алег Краўцэвічус, Анжэла Пічугіна, Аляксандр Мішчанка, Святлана Азбель, Анжэла Марыніна і астатнія будучыя гісторыкі і філолагі, якія больш месяца ўдзельнічалі ў раскопках, з радасцю дакрануліся да таямніц Пасожжа. Упэўнена, што цяпер у парк культуры і адпачынку імя Луначарскага яны будуць ісці, як у музей.

Пашанцавала нам і ў другім: за час раскопак мы блізка пазнаёміліся, пасябравалі. Лічу, што гэта дружба будзе мацавацца на працягу ўсёй нашай вучобы ва ўніверсітэце.

**А. ЕРМАКОВА,**
**студэнтка групы БР-13 гістфіла.**



**НА ЗДЫМКАХ: 1. Першакурснікі Э. Левін і А. Краўцэвічус у час раскопак. 2. Студэнт 4-га курса гістфіла С. Міхайлоўскі старанна апрацоўвае кожны сантыметр пласта. 3. Знаходка XVII стагоддзя — цацка-свістулька.**

**Фота Л. Акінчыц.**





і літаратурнага «Верас» — інтэрнат № 4 на Валатаве, клубы маладой сям'і «Бусел» і літатурны «Крыніцы» прапісаліся ў трэцім інтэрнаце. Астатнія працуюць непасрэдна пры клубе «Маладосць».

Заслугоўвае высокай ацэнкі дзейнасць літаратурнага клуба студэнтаў-матэматыкаў «Градыент». Адна з адметных яго рыс — пастаянны пошук. Новае — гэта заўсёды і рызыка: ці атрымаеццца так, як задумана? Але тут на яе ідуць свядома. Самаўпэўненасць? Не. Сакрэт поспеху клуба ў тым, што гэта сапраўды калектыў аднадумцаў, з сугучнасцю сэрцаў і душ. Але, бадай, самае каштоўнае ў «Градыента» тое, што ён не стаў «замкнёным колам», а выйшаў за рамкі сваёй камернасці.

Параўнальна малады яшчэ адзін літаратурны клуб — «Верас», які ўтварыўся на базе факультэта педагагічнай этыкі народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання. Аднак і ён заявіў аб сабе цікавымі справамі. Фантазія яго членаў пераўтварыла адзін з пакояў інтэрната на Валатаве ў літаратурную гасцінюю, з любоўю і густам афармленую. Яна стала ўтульным месцам пасяджэнняў клуба, цікавых сустрэч, дыскусій. Тут на суд сяброў выносяць свае паэтычныя спробы пачынаючыя самадзейныя паэты біялагічнага факультэта. Клуб аб'яднаў іх творчую думку, развівае ініцыятыву рабят, робіць іх жыццё духоўна насычаным.

Адны аматарскія калектывы і клубы ўжо амаль дасягнулі сваёй сталасці, другія — пакуль што на пачатку шляху да яе. І каб яны сталі такімі, якімі павінны быць, выконвалі высокую выхаваўчую і эстэтычную функцыі, ім неабходна ўсямерная дапамога і падтрымка. Яе аказваюць клуб «Маладосць», народны універсітэт маральна-эстэтычнага выхавання, камітэт камсамола, прафком студэнтаў. Аднак пракантраляваць работу ўсіх 14 клубаў і аб'яднанняў, накіраваць іх у патрэбнае рэчышча не вельмі проста. На думку кіраўнікоў клуба «Маладосць», наспела неабходнасць у тым, каб усёй іх работаў кіраваў метадыст па аматарскіх аб'яднаннях і клубах па інтарэсах. Бо свайго вопыту ім пакуль што не хапае.

Немалаважную ролю ў эфектыўнай рабоце аматарскіх аб'яднанняў адыгрывае іх матэрыяльная база. Не ўсе, на жаль, аб'яднанні маюць свой асобны пакой у інтэрнаце, дзе ўсё адпаведна афомлена, як, напрыклад, у КІДа, клубаў «Гаспадынька», «Верас» і інш. Аднак, унутраныя рэзервы ёсць: пустуюць падвальныя памяшканні ў інтэрнаце № 3, дзе пасля невялікага іх пераабсталявання змаглі б размясціцца некаторыя клубы. Ёсць яшчэ адно выйсце — у адным пакоі маглі б стаць суседзямі аб'яднанні аднаго напрамку.

— Не вельмі проста вырашыць пытанне аб матэрыяльным забеспячэнні аматарскіх аб'яднанняў і клубаў па інтарэсах, — зазначае старшыня прафкома студэнтаў Н. І. Колтышава. — Аднак мы імкнемся ісці насустрач ім. Вось, напрыклад, набылі чайныя сервізы, самавары, электраплiты для клубаў «Гаспадынька» і «Алеся». Зразумела, што якаснае паляпшэнне работы аматарскіх калектываў немагчыма толькі на энтузіязме студэнтаў. Хаця без яго таксама не абысціся. Таму фінансавае пытанне застаецца пакуль што адным з набалелых. Вырашыць яго самастойна прафком не можа, на гэта патрэбен афіцыйны дазвол.

Праблем і нявырашаных пытанняў пакуль нямала. Як справіцца з імі, у каго і дзе павучыцца, пераняць вопыт? Адказу пакуль што няма, бо не існуе ў Гомелі, у ВНУ вобласці ўзорных аматарскіх аб'яднанняў і клубаў па інтарэсах. Спробы наладзіць іх вучобу, абмен думкамі прымаліся сёлета на абласным семінары па арганізацыі гэтай работы. Аднак узяць адтуль што-небудь для сябе універсітэцкія аб'яднанні не змаглі, бо мастацкаму кіраўніку клуба самадзейнасці давялося на ім больш расказваць аб рабоце ў даным напрамку ГДУ, а не пераймаць нешта цікавае ў іншых. Былі ў голасе ўдзельнікаў семінара і ноткі недаверу, калі потым тым яны ацэньвалі тое, што робіцца ў ГДУ. «Як гэта, такая колькасць аматарскіх аб'яднаннаняў — 14! Гэта ж пагоня за колькасцю, а не якасцю». Словам, падыйшлі яны да гэтага са сваімі ўласнымі меркамі.

Неаднаразова правяралі работу клубаў па інтарэсах у ГДУ і шматлікія праверкі розных узроўняў. У цэлым яны далі станоўчую ацэнку зробленаму, адзначылі недапрацоўкі, выслухалі выказаныя ў клубе «Маладосць», прафкоме студэнтаў пажаданні. Застаецца спадзявацца, што пасля гэтых праверак неабходная дапамога клубам будзе аказана.

А ва універсітэце пакуль што не бяздзейнічаюць.

— У перспектыве будзем наладжваць работу так, — гаворыць мастацкі кіраўнік клуба самадзейнасці ГДУ М. Шырынкіна, — каб аматарскія аб'яднанні і клубы па інтарэсах узаемадзейнічалі паміж сабой, выносілі свае выступленні як арганізаваны калектыў на універсітэцкую сцэну. Спробы дзелавога супрацоўніцтва клубаў ва універсітэце ўжо ёсць.

Удзел студэнтаў у аматарскіх аб'яднаннях развівае іх ініцыятыву, абуджае творчую думку, духоўна ўзбагачае. Гэта — актыўны від адпачынку моладзі. Яна становіцца не спажыўцом культуры, а яе стваральнікам. У гэтым самая галоўная каштоўнасць аматарскіх аб'яднанняў, клубаў па інтарэсах. Таму і ўвага да іх павінна быць асаблівай.

**Т. ДУБЯК.**

## НАШЫ ЮБІЛЯРЫ



У ЖЫЦЦІ дацэнта кафедры агульнай фізікі Вячаслава Рыгоравіча Пінчука адбылася знамянальная падзея — яму споўнілася 50 гадоў з дня нараджэння. Гэта — значная вяха: пройдзены перыяд станаўлення асабістых і сацыяльных якасцей дае магчымасць гаварыць аб жыццёвых каштоўнасцях чалавека.

Жыццёвы шлях юбіляра — прыклад беззапаветнага служэння навуцы, плённай работы па выхаванню кваліфікаваных кадраў для народнай гаспадаркі краіны.

Нарадзіўся Вячаслаў Рыгоравіч у рабочай сям'і на Гомельшчыне. З 1954 года ён — курсант Пермскага ваеннага авіяцыйнага вучылішча. Затым вучыцца ў Пермскім дзяржаўным універсітэце імя А. М. Горкага, працуе ў Калінінградскім вышэйшым ваенна-марскім вучылішчы.

Цяга да ведаў, высокая працаздольнасць прывялі В. Р. Пінчука ў аспірантуру фізіка-тэхнічнага інстытута АН УССР. Пасля паспяховай абароны дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук Вячаслаў Рыгоравіч працуе ў ГДУ.

Усе, хто знаёмы з В. Р. Пінчуком, хто працаваў і працуе побач з ім, ведаюць яго як добрасумленнага, прынцыповага і адказнага супрацоўніка, высокакваліфікаванага педагога, чулага таварыша, які заўсёды прыйдзе на дапамогу.

З першых гадоў працы ў ГДУ Вячаслаў Рыгоравіч займаецца актыўнай навукова-даследчай дзейнасцю. На яго рахунку больш 50 навуковых прац, аўтарскіх пасведчанняў на вынаходніцтвы. Яго мэтанакіраваныя і змястоўныя навуковыя распрацоўкі прадстаўляліся на 4 міжнародных і 17 усесаюзных канферэнцыях. Адна з іх дэманстравалася на ВДНГ СССР у павільёне «Рацыяналізацыя і вынаходніцтва». Разам з аўтарскай групай В. Р. Пінчуком напісана кніга «Павышэнне зносастойкасці на аснове выбарчага пераносу». Многія работы знайшлі шырокае прымяненне ў народнай гаспадарцы. Так, ён распрацаваў тэхнічныя рэкамендацыі для двух прадпрыемстваў г. Пярмі па зніжэнню зносу матэрыялаў. Атрыман значны эканамічны эфект ад укаранення вынікаў навуковых распрацовак у вытворчасць.

На працягу ўсёй сваёй працоўнай дзейнасці В. Р. Пінчук павышае свой навуковы і ідэйны ўзровень. У 1977 г. праходзіў навуковую стажыроўку ў ГДР, з 1984 г. Вячаслаў Рыгоравіч — член навуковага Савета АН БССР па сваёй спецыялізацыі.

Плённая навукова-даследчая дзейнасць Вячаслава Рыгоравіча адзначана прысваеннем яму звання лаўрэата VII навуковых універсітэцкіх чытанняў, прысвечаных 115-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

В. Р. Пінчук вядзе вялікую вучэбна-педагагічную работу са студэнтамі на кафедры агульнай фізікі. Не менш плённая і яго навукова-даследчая дзейнасць: ён кіруе дзвюмя гаспадарча-дагаворнымі тэмамі, працуе над доктарскай дысертацыяй.

Дэканат, партыйная і прафсаюзная арганізацыі фізічнага факультэта, калектыў кафедры агульнай фізікі горача віншуюць Вячаслава Рыгоравіча з юбілеем і жадаюць яму далейшых творчых поспехаў на карысць нашай сацыялістычнай Радзімы.

**Д. ЛІН,**
**загадчык кафедры агульнай фізікі, дацэнт.**

**В. КОЦУР,**
**праforг кафедры.**

# ПАЧЫНАЦЬ З ДЫСЦЫПЛІНЫ

Вышэйшая школа знаходзіцца на шляху сваёй карэннай перабудовы. У гэтай важнай справе не можа быць ніякіх дробязей. Асабліва ў арганізацыі вучэбнага працэсу. Тут павінна быць забяспечана перш за ўсё высокая дысцыплінаванасць студэнтаў, выкладчыкаў, супрацоўнікаў. На жаль, яшчэ даводзіцца сустракацца з няўвязкамі, непаладкамі і г. д.

...9-га кастрычніка. Званок абвясціў аб пачатку заняткаў. У калідорах ўсталёўваецца цішыня. І калі ў холе трэцяга паверха вучэбнага корпуса № 1 мы сустрэлі групу юнакоў і дзяўчат, гэта адразу выклікала непаразуменне.

На наша пытанне, чаму не на занятках, прысутныя адказалі:

— Не можам зайсці ў аўдыторыю 3—5. Яна закрыта.

Высветлілася, што гэта былі студэнты факультэта фізічнага выхавання. Лекцыю для іх па гісторыі педагогікі павінен быў чытаць асістэнт Г. А. Гудзілін. Ён не здолеў своечасова прыступіць да заняткаў па адной прычыне: шукаў ключ ад названай аўдыторыі. На дапамогу яму прыйшоў і дэкан факультэта Б. М. Зайцаў.

У вахцёра ключа не аказалася. Яго забрала прэпаратар кафедры батанікі і фізіялогіі раслін І. Ф. Мечычэнка. Менавіта яна павінна была своечасова адкрыць аўдыторыю. Не зрабіла гэтага. А на пошукі ключа было страчана каля 10 мінут.

Чаму ж так здарылася? Тлумачэнне адно: вядзецца рамонт аўдыторый першага паверха. Студэнтам факультэта фізвыхавання даводзіцца займацца і на плошчах, замацаваных за біяфакам. Таму іншы раз і атрымліваецца неразбярыха. Дапускаць яе нельга ні ў якім разе. Трэба з ўсёй сур'ёзнасцю ставіцца да тых, хто адказвае за арганізацыю вучэбнага працэсу.

## СПОРТ

### ПЕРШАКУРСНІК — СЯРОД ПРЫЗЁРАЎ

**У мінулую нядзелю праведзена першынство абласнога савета** прафсаюзаў па асенняму лёгкаатлетычнаму кросу, якое прысвячалася Дню Канстытуцыі СССР. На старт выйшлі і студэнты нашага універсітэта. Найбольшага поспеху сярод іх дасягнуў першакурснік факультэта фізічнага выхавання кандыдат у майстры спорту А. Крываротаў. На дыстанцыі 8 км ён аказаў дастойную канкурэнцыю мацнейшым красменам Гомельшчыны і на фінішы быў другім. Яго вынік — 24 мінуты 8 секунд.

## ГЭТА ЦІКАВА

# ВЫДАДЗЕНА Ў ГОМЕЛІ

У нашай краіне выйшла нямала ясенінскіх кніг. І ў гэтым няма нічога дзіўнага. Сяргей Ясенін па-ранейшаму застаецца ў ліку самых папулярных савецкіх паэтаў.

Цікава, што першая кніга пра С. Ясеніна ў Беларусі выйшла... у Гомелі, у 1926 годзе. Гэта, бадай, адзінае ў нашай рэспубліцы выданне аб творчасці спевака рускай прыроды.




А справа была так. Вясной 1922 года, у разгул НЭПа, Гомельскі губком пастанавіў стварыць кааператыўнае выдавецтва «Гомельский рабочий». На працягу лета праходзіла вярбоўка членаў кааператыва, а восенню ўжо была выдадзена першая брашура. Быў распрацаваны выдавецкі план і да канца 1922 г. выйшлі 23 кнігі агульным тыражом 130 тысяч экземпляраў. Гэта былі ў асноўным даступныя па цане марксісцкія кнігі, навукова-папулярныя брашуры.

У наступныя гады выдавецтва павялічыла выпуск твораў пісьменнікаў—класікаў і дасягнула свайго росквіту. Аб яго паспяховай рабоце гаворыць цікавы факт. Кнігі з маркай выдавецтва «Гомельский рабочий» пасылаліся нават у Швейцарыю, у бібліятэку выдатнага рускага бібліёграфа і асветніка Н. А. Рубакіна. У той жа час выдавецтва друкавала і яго навуковыя працы.

Аўтар кнігі пра С. Ясеніна Г. Лялевіч нарадзіўся ў г. Магілёве, у сям'і паэта-рэвалюцыянера. З дзяцінства ён піша вершы. У 16 гадоў уступіў у партыю. Калі вясной 1918 г. немцы і палякі паспяшаліся заняць яго родны горад, яму давялося эвакуіравацца ў радах партыйнага баявога атрада. Ён працуе ў г. Арле, Самары, Гомелі. Тут у 1921 г. выходзяць яго паэма «Голад» і зборнік вершаў «Набат». Праз два гады Г. Лялевіч ужо на партыйнай рабоце ў Маскве. Ён прызначаецца адным з кіраўнікоў новага літаратурна-крытычнага часопіса «На посту» і цалкам аддаецца рабоце. Гэта быў зорны час Г. Лялевіча. Ён піша серыю нарысаў па гісторыі грамадзянскай вайны і захапляецца крытыкай. У вострай барацьбе літаратурных цячэнняў і груп 20-х гадоў, з пазіцыі ваяўнічай пралятарскай партыйнасці напісаны ім артыкул пра Сяргея Ясеніна, які затым выходзіць асобным выданнем у Гомелі. Нягледзячы на некаторы сектанскі падыход да творчасці Ясеніна, што было характэрнай з'явай тых гадоў, Лялевіч у цэлым дае правільную ацэнку яго творчасці, робячы пры гэтым упор на ідэйна-грамадзянскае гучанне.

Трагічная смерць «першакласнага лірычнага паэта» глыбока ўзрушыла Г. Лялевіча. Незадоўга да ракавога ад'езду Ясеніна ў Ленінград яны па-сяброўску гутарылі. Паэт дзяліўся з ім сваімі творчымі планамі. Абараняючы С. Ясеніна ад нападкаў нэпаўскай братвы, Г. Лялевіч піша: «Вершы перыяду Русі Савецкай такія задушэўныя і шчырыя, як і ўся папярэдняя творчасць С. Ясеніна». Па прастаце і яснасці ён пераўноўвае іх з пушкінскімі вершамі. Гэта была адна з першых спроб, прычым даволі аб'ектыўных, ацаніць творчасць паэта. А быў жа тады час складаны, супярэчлівы.

Па-прароцку гучаць апошнія радкі кнігі Г. Лялевіча: «Рэвалюцыя не ўсынавіць Ясеніна—містычнага паэта старой Русі, не ўсынавіць яна і пратэстанта супраць гарадской культуры і тэхнікі. Але яна любоўна ўсынавіць таго Ясеніна, які высакародна, шчыра, напружана спрабаваў зразумець эпоху, «дагнаць стальную рацы», спалучыць сваю творчасць з рэвалюцыйнай сучаснасцю і зламаўся пад цяжарам прынятай на сябе цяжкай і ганаровай ношы».

...Прайшло 60 гадоў з дня выхаду гэтай маленькай сшытковай кніжачкі. Але яна і цяпер уражвае сваім прыгожым паліграфічным выкананнем. На вокладцы ў авале рэдкі, вялікі партрэт С. Ясеніна. Гэта нібы аб гэтай кніжцы пісаў паэт Я. Смелякоў:

**Там на обложечке весенней,**
**лицом прекрасен и влюблен,**
**поэт страны Сергей Есенин**
**был бережно изображен.**

Дарэчы, у маёй бібліятэцы ёсць шмат ясенінскіх выданняў, але толькі ў зборніку С. Ясеніна 1946 года, складзеным жонкай паэта С. А. Талстой, паўтараецца аналагічны фотаздымак. Гэта гаворыць аб тым, з якой любоўю падышлі тады да афармлення ясенінскай кнігі ў Гомелі. Буйным чырвоным шрыфтам набрана яе назва «Сергей Есенин», а ніжэй назва выдавецтва — «Гомельский рабочий», 1926. Размер выдання — 130×176 мм, аб'ём 44 старонкі. Ёсць у ім адна ілюстрацыя-факсіміле перадсмяротнага верша паэта «До свиданья, друг мой, до свиданья...» Кніга надрукавана на добрай паперы ў Гомельскай друкарні «Палесдрук» тыражом 3100 экземпляраў. Па мерках тых часоў гэта быў даволі значны тыраж.

Ёсць добры лацінскі афарызм: «Кнігі маюць свой лёс». На жаль, лёс гомельскіх кніжачак аказаўся трагічным. Шмат суровых выпрабаванняў выпала на іх долю. Зараз гэтага каштоўнага выдання няма нават у многіх буйнейшых кнігасховішчах нашай краіны. Як самую дарагую рэліквію захоўваю я яго ў сваёй Есеніяне.

**У. ФРЫДМАН.**

**НА ЗДЫМКУ: так выглядае вокладка рэдкага выдання кнігі пра С. Ясеніна, якая выйшла ў Гомелі ў 1926 годзе.**

## НА КНІЖНАЙ ПАЛІЦЫ

### ПА РОЗНЫХ ГАЛІНАХ ВЕДАЎ

У кніжным магазіне № 19 (вул. Савецкая, 106) з'явіліся ў продажы навінкі літаратуры, якая выйшла ў выдавецтве «Университетское».

ГАБАСАЎ Р., КІРЫЛАВА Ф. М., КАСЦЮКОВА В. І. **Канструктыўныя метады аптымізацыі: у 5-ці ч. Ч. 3. Сеткавыя задачы.** -Мн., «Университетское», 1986.

Пяць класаў сеткавых дынамічных задач уключаюць тыповыя сітуацыі, якія ўзнікаюць пры разліку аптымальных планаў з улікам фактару часу. Прыводзяцца вынікі лікавага эксперыменту.

Кніга разлічана на спецыялістаў, занятых рашэннем разнастайных прыкладных аптымізацыйных задач. Можа быць карыснай студэнтам і аспірантам матэматычных спецыяльнасцей ВНУ.

ЛАШКЕВІЧ В. А. **Змітрок Бядуля — дзецям.** — Мн., «Университетское, 1986.

Даследуецца багатая творчая біяграфія З. Бядулі — дзіцячага пісьменніка і педагога. Даецца ідэйна-эстэтычны аналіз дарэвалюцыйнай творчасці З. Бядулі, прысвечанай тэме дзяцінства, а таксама твораў, напісаных ім у савецкі час.

Кніга адрасавана літаратуразнаўцам, педагогам, студэнтам-філолагам.

БЛУЎШТЭЙН Ю. Д., ЗЫРЫН М. І., РАМАНАЎ В. В. **Прафілактыка злачынстваў. Вучэбны дапаможнік.** -Мн., «Университетское», 1986.

У кнізе выкладзены асновы тэорыі і арганізацыі прафілактыкі злачынстваў. Аналізуюцца віды, формы і метады прафілактыкі злачынстваў.

Для студэнтаў юрыдычных спецыяльнасцей ВНУ.

АНТЫ-БАХУС АБО ПРА ЗЛОСНУЮ ЗАГАНУ. Апавяданні, нарысы, артыкулы. -Мн., «Университетское», 1986.

У зборнік уключаны творы, у якіх з вялікай эмацыянальнай сілай паказана, якую шкоду прыносіць ужыванне спіртных напіткаў. Развенчваецца, у прыватнасці, «тэорыя» выхавання так званай культуры застолля як сродка барацьбы супраць п'янства.

Кніга — для шырокага кола чытачоў.

АПАНАСОВІЧ В. В., ЦІХАНЕНКА В. М. **Лічбавае мадэліраванне стахастычных сістэм. Вучэбны дапаможнік.** -Мн., «Университетское», 1986.

Для студэнтаў універсітэтаў па спецыяльнасці «Радыёфізіка і электроніка».

ЛАПІДУС Н. І. **Антычная літаратура.** -Мн., «Университетское, 1986.

Вучэбны дапаможнік для студэнтаў філалагічных факультэтаў і факультэтаў журналістыкі. Напісаны ў адпаведнасці з дзеючай вучэбнай праграмай. Упершыню прыводзяцца малавядомыя і невядомыя факты аб уплыве антычнай класікі на беларускую літаратуру, аб перакладах старажытных аўтараў на беларускую мову.

**Н. ШАТОН,**
**старшы прадавец магазіна.**

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

А343520

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 57-16-52.
Заказ 757.